ДЛЯ СПОРТУ І НЕ ТОЛЬКІ

Што атрымала наша краіна ад правядзення мультыспартыўнага турніру і якую спадчыну пакінулі пасля сябе Гульні для кожнага беларуса

II Еўрапейскія гульні ў Мінску ўжо сталі гісторыяй, але ўспаміны пра гэтыя дзесяць дзён яшчэ свежыя ў памяці. Цяпер традыцыйна настаў час падвядзення вынікаў. Калі казаць пра спартыўны складнік, то турнір у Мінску быў вельмі паспяховы для беларускай каманды, пра гэта заявіў першы намеснік міністра спорту і турызму Беларусі, шэф місіі беларускай дэлегацыі на II Еўрапейскіх гульнях Вячаслаў ДУРНОЎ. Ён адзначыў, што перад стартам турніру ніхто не агучваў спартсменам колькасць медалёў, якія яны павінны заваяваць, але вынік перасягнуў усе планы і чаканні.

«69 медалёў — гэта дасягненне. Нам хацелася перасягнуць колькасць узнагарод у Баку, і гэта атрымалася, — адзначыў Вячаслаў Дурноў. — Практычна ўсе віды спорту ў нас былі медальныя, напэўна, за выключэннем бадмінтона, які мы толькі развіваем. Няўдалым атрымалася выступленне беларусаў у настольным тэнісе. Але змагаліся ўсе. Прыемна і тое, што нашы спартсмены заваявалі дзве ліцэнзіі (у стральбе і лёгкай атлетыцы) на ўдзел у Алімпійскіх гульнях у Токіа».

Таксама Вячаслаў Дурноў падкрэсліў, што, нягледзячы на тое што ў Беларусі такія маштабныя спаборніцтвы праводзіліся ўпершыню, арганізатарамі не было дапушчана ніякіх зрываў. Гэта датычыцца ўсяго: і арганізацыі, і харчавання, і пражывання, і правядзення спартыўных спаборніцтваў. «Еўрапейскія гульні — праект новы, малады, і мы падтрымалі яго на належным узроўні і далі пуцёўку ў далейшае жыццё», — адзначыў першы намеснік міністра спорту і турызму.

***

Намеснік дырэктара фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Анатоль КОТАЎ, кажучы пра вопыт і спадчыну турніру для краіны, у першую чаргу спыніўся на тым, што найбольш адчувальна. «Непасрэдна да Гульняў была завершана рэканструкцыя стадыёна «Дынама». За кадрам таксама засталіся яшчэ чатыры аб'екты, якія атрымала краіна дзякуючы правядзенню Гульняў. Гэта Палац гімнастыкі, у якім трэніраваліся нашы зоркі, што падымаліся на п'едэстал у Мінску, мадэрнізацыя базы шэрагу нашых зборных «Стайкі», РНПЦ спорту і вучылішча алімпійскага рэзерву, якое заклікана рыхтаваць змену тым зоркам, якія ўжо пабывалі на п'едэстале. Таксама адным з самых адчувальных вынікаў правядзення ў краіне Гульняў стала мадэрнізацыя Студэнцкай вёскі — там з'явіўся новы стадыён, абсалютна новая паліклініка, былі здадзены два дадатковыя інтэрнаты. З 1 верасня, я думаю, студэнты павінны сказаць нам дзякуй і дараваць некаторыя нязручнасці, звязаныя з перамяшчэннем іх на час рамонту і Гульняў у іншыя месцы сталіцы», — расказаў Анатоль Анатолевіч. Таксама ён адзначыў, што ў краіне засталося ўсё тое дарагое спартыўнае абсталяванне, якое закуплялася да Гульняў. Горад атрымаў больш за 300 новых аўтобусаў і электробусаў, істотна абнавіліся аўтапаркі абласных транспартных арганізацый. Анатоль Котаў падкрэсліў, што пры куплі тэхнікі арганізатары загадзя прадумвалі, дзе яна будзе выкарыстоўвацца пасля Еўрапейскіх гульняў.

«Акрамя таго, мы набылі каласальны вопыт у плане падрыхтоўкі, разлікаў і правядзення мультыспартыўнага мерапрыемства. На кожным аб'екце нам удалося стварыць каманды прафесіяналаў, якія забяспечылі правядзенне Еўрапейскіх гульняў на высокім арганізацыйным узроўні. У нас з'явілася вялікая спадчына ў выглядзе вялізнай «арміі» валанцёраў, найлепшыя з іх ужо атрымалі свае ўзнагароды ад адміністрацыі Прэзідэнта», — дадаў Анатоль Котаў.

***

Мінск на працягу двух гадоў рыхтаваўся да таго, каб сустрэць гасцей Еўрапейскіх гульняў належным чынам. **Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення спорту і турызму Мінгарвыканкама Святлана ДЗЯМЕШКА** адзначыла, што для прыцягнення турыстаў і стварэння камфортнага асяроддзя было праведзена 12 тураў для прадстаўнікоў замежных СМІ і турыстычных кампаній. Сумесна з Дырэкцыяй II Еўрапейскіх гульняў было арганізавана 20 гарадскіх інфармацыйных пунктаў, якія карысталіся вялікай папулярнасцю ў турыстаў. За час Гульняў іх наведала 132 тысячы чалавек. «Цяпер яшчэ нельга назваць дакладную лічбу замежнікаў, якія наведалі Беларусь за гэты час. Смела можна сказаць, што турыстаў было больш за 30 тысяч, але гэтая лічба не канчатковая, у яе ўваходзяць як замежнікі, так і нашы калегі з рэгіёнаў», — паведаміла Святлана Дзямешка.

Начальнік аддзела арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Вольга ЕЗАПЯНКОВА расказала, што падчас правядзення Еўрапейскіх гульняў у Мінску самым папулярным напоем быў квас. Яго прадалі каля сямі тысяч дэкалітраў, гэта значыць 580 дэкалітраў у дзень, што ў 2,8 раза больш, чым у сярэднім у дзень у маі. Павышаным попытам таксама карысталася марозіва — яго рэалізавана каля 150 тон. Сярэдні чэк пакупкі на фан-зонах складаў 20 рублёў, а тавараабарот аб'ектаў грамадскага харчавання на фан-зонах і спартыўных аб'ектах — больш за 1 мільён 200 тысяч рублёў. «Што датычыцца сувенірнай прадукцыі, сярэдні чэк пакупак склаў 20—50 рублёў у залежнасці ад спартыўнага аб'екта. У Вёсцы спартсменаў сярэдні чэк у сувенірнай краме — 100 рублёў. Максімальныя сумы, якія трацілі госці на сувеніры, дасягалі 600—1000 рублёў. Напрыклад, румынскія спартсмены ў Вёсцы купілі футболак і Лесікаў на 6000 рублёў», — адзначыла Вольга Езапянкова. Усяго за час II Еўрапейскіх гульняў была рэалізавана сувенірная прадукцыя на суму звыш 1 мільёна 220 тысяч рублёў.

Самую высокую ацэнку ад Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў заслужыла і арганізацыя харчавання ў Вёсцы спартсменаў. Гэта датычыцца якасці прадуктаў, узроўня абслугоўвання і чысціні, адзначыла **начальнік упраўлення па арганізацыі харчавання фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Юлія КРАЎЧАНКА.** «У асноўнай сталоўцы Вёскі спартсменаў быў прыгатаваны 43 661 рацыён, гэта 99 364 кілаграмы ежы. Выпіта каля 56 тысяч літраў напояў, 41 працэнт з іх — пітная вада», — адзначыла Юлія Уладзіміраўна. Самымі папулярнымі прадуктамі былі «малочка», паста, гародніна і садавіна, стравы з мяса, птушкі і рыбы. Таксама госці елі шмат піцы, дарэчы, нават італьянцы адзначалі, што беларусы ўмеюць гатаваць іх нацыянальную страву. У сярэднім спартсмен у суткі з'ядаў 3,5 кілаграма ежы.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

БАЗАРНЫ ДЗЕНЬ

Чараўніцтва лічбаў і песень

Традыцыйна ў цэнтры ўвагі фэсту № 1 на постсавецкай прасторы — конкурсы. Гэтымі днямі — дзіцячы. Дарэчы, калі ўспомніць прозвішчы вельмі запатрабаваных сёння артыстаў, якія калісьці былі яго ўдзельнікамі, спіс будзе доўгі.

Штогод для юных канкурсантаў у дырэкцыі прыдумляюць магчымасць літаральна трапіць у казку. Сёлета яны сталі гасцямі старога Хатабыча. І гэта невыпадкова: Лазар Лагін, аўтар гэтага і ў наш час вельмі папулярнага твора для дзятвы жыў у Віцебску, калі сам быў маленькі. Недалёка ад месца, дзе знаходзіўся яго дом, на беразе ракі Віцьба, каля скульптуры чараўніка і пачалася цырымонія жараб'ёўкі ўдзельнікаў конкурсу. А працягнулі яе ў канцэртнай зале «Віцебск», дзе і праходзяць конкурсныя выступленні.

Упершыню сярод тых, хто змагаецца за прызавыя месцы, аказалася прадстаўніца Індыі. Журы дзіцячага конкурсу ўзначальвае шведская зорка — выканаўца, кампазітар і музыкант Босан. 8 ліпеня ў юных выканаўцаў адбылося першае выступленне на «Славянскім базары ў Віцебску».

Кожны канкурсант выканаў песню кампазітара краіны, якую прадстаўляе на роднай мове. Наша зямлячка Ксенія Галецкая выступіла пад нумарам 18. Дарэчы, у размове з прадстаўнікамі СМІ прадстаўніца Беларусі сказала, што для яе не вельмі важна, пад якім нумарам выступаць. Бо верыць яна не ў магію лічбаў, а ў тое, што журы ацэніць вынік яе намаганняў па падрыхтоўцы да творчага спаборніцтва.

Сёння беларуска выйшла на сцэну пад нумарам 19. Дарэчы, удзельнікі ў другі дзень выпрабавання маюць права выканаць любую песню на свой выбар.

Па добрай традыцыі балы пасля выступлення не агучваюць. Імёны тых, хто стане ўладальнікам Гран-пры (пяць тысяч долараў), першай, другой і трэцяй прэмій, стануць вядомыя 11 ліпеня пасля завяршэння гала-канцэрта.

Учора ж адной з галоўных падзей «Славянскага базару» можна было назваць цырымонію падняцця сцяга фэсту — у комплексе Летняга амфітэатра. Упершыню яна адбылася ў вячэрні час.

А дзясятай вечара на галоўнай сцэнічнай пляцоўцы пачаўся феерычны канцэрт «Уверцюра да фестывалю: ад класікі да рока». Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора Віктара Бабарыкіна аздобіў выступленні выканаўцаў з Беларусі, Італіі, Карэі, Францыі, Малдовы, Расіі.

Сёння ў Віцебску насычаная праграма, як, у прынцыпе, і на працягу ўсяго тыдня. У фестывальнай афішы — пастаноўкі ў Беларускім тэатры «Лялька» і Нацыянальным акадэмічным драмтэатры імя Якуба Коласа, мастацкія выстаўкі, канцэрты папулярных артыстаў з Расіі Emin і Стаса Міхайлава.

Заўтра адбудзецца афіцыйнае адкрыццё самага маштабнага фестывалю нашай краіны. Нагадаем, што падчас фэсту курсіруе дадатковы цягнік з Мінска ў Віцебск і назад. Са сталіцы ён адпраўляецца ў 12.42, з Віцебска — у 1.30. Для многіх мінчан экскурсія аднаго дня па «хлеб і відовішчы» стала традыцыяй.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота БелТА.

Добрая справа

БОЛЬШ ЯК 1200 ДОЛАРАЎ ЗА ПЛАСТЫКАВЫЯ НАКРЫЎКІ

Атрымалі актывісты сацыяльна-экалагічнага дабрачыннага праекта «Новае жыццё ў абмен на накрыўкі». Грошы перадалі на лекі і прагулачную каляску аднаму з падапечных праекта Грышу Доўгіх. За дзевяць месяцаў, дзякуючы асобнаму збору накрывак з-пад бутэлек, напояў, тэтрапакаў, бытавой хіміі і парфумерыі, удалося «закруціць першую добрую справу», кажуць арганізатары праекта.

Штогод у Беларусі ўтвараецца больш за 4000 тон пластыкавых накрывак, кошт якіх як другаснай сыравіны — каля 800 тысяч долараў. Накрыўка і кальцо з-пад яе вырабляюцца з карыснага пластыку, які можна перапрацаваць як другасныя матэрыяльныя рэсурсы ў гранулы. А ўжо з іх пасля ствараюць новыя палімерныя вырабы, канцтавары, адзенне, мэблю.

— У нашага падапечнага Грышы ДЦП і спастычны тэтрапарэз 3-й ступені цяжкасці. Дзякуючы ўдзельнікам праекта ў хлопчыка з'явілася неабходная каляска, якая дазваляе яму самастойна ўтрымліваць галаву і спіну. Яму набылі лекі, — падзялілася **кіраўнік праекта «Новае жыццё ў абмен на накрыўкі» Наталля КУНЦЭВІЧ.** — Спецыяльныя кантэйнеры для збору накрывак стаяць, напрыклад, у гандлёвых цэнтрах нашых партнёраў, што далучыліся да акцыі, крамах «Віталюр», «Суседзі», «Буслік».

У кантэйнеры можна кідаць усе пластыкавыя накрыўкі з маркіроўкай «02»/«2», «04»/«4», «05»/ «5». Яны павінны быць чыстыя і без металічных, фальгіраваных ці папяровых укладышаў. Калі ў тых, хто хоча дапамагчы людзям з інваліднасцю, ёсць магчымасць адсартаваць накрыўкі, перш чым пакласці іх у кантэйнер ці перадаць валанцёрам праекта, гэта будзе яшчэ лепш, бо такая сыравіна каштуе даражэй.

Даведацца пра пункты збору пластыкавых накрывак у Беларусі можна па спасылцы https://vk.com/topic-12715323_39979593.

Ірына СІДАРОК.